**Problems of Foreign Linguistics, Literary and Cultural Studies, L2 Teaching and Acquisition Nr 1-2/2021**

## Вольга Кавальчук

кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры рускай літаратуры і журналістыкі

Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна

# Асабістае і грамадскае ў кантэксце ваенных падзей у паэме А. Куляшова "Сцяг брыгады": галерэя чалавечых тыпаў, архетыпічныя ідэялагемы

**Keywords:** axiology, double technique, poem, semantic layers, Arkady Kuleshov, belarusian literature, philosophical problems.

**Ключавыя словы:** аксіялогія, прыём двайніка, паэма, сэнсавыя пласты, Аркадзь Куляшоў, беларуская літаратура, філасофскія праблемы.

**Abstract:**

The author of the article analyzes the philosophical problems of Arkady Kuleshov's poem "The Brigade Banner" and comes to the conclusion that the structure of the work includes several semantic layers that build a kind of hierarchy of values. The epic and lyrical beginnings of the poem help to strengthen the social and personal components of axiology, respectively. The artistic technique of the double makes the problem of a person's choice more vivid and significant in the context of military events.

**Рэзюмэ:**

Аўтар артыкула аналізуе філасофскую праблематыку паэмы Аркадзя Куляшова "Сцяг брыгады" і прыходзіць да высновы, што структура твора ўключае некалькі сэнсавых пластоў, якія будуюць своеасаблівую іерархію каштоўнасцей. Эпічны і лірычны пачаткі паэмы дапамагаюць узмацніць грамадскія і асабістыя кампанентцы аксіялогіі адпаведна.

Мастацкі прыём двайніка робіць праблему выбара чалавека больш яскравай і значнай у кантэксце ваенных падзей.

Паэма „Сцяг брыгады” з'яўляецца адным з самых вядомых твораў Аркадзя Куляшова. Нездарма яе называюць „вяршыняй ваеннай творчасці” мастака слова [3, с. 8]. Валянціна Куляшова, дачка паэта, адзначае: „Паэма, за якую Куляшоў атрымаў Дзяржаўную прэмію 1-й ступені, была і застаецца найлепшым творам, прысвечаным падзеям Айчыннай вайны, у савецкай паэзіі” [3, с. 8]. Аднак сучасная навука патрабуе перагляду некаторых мінулых ацэнак з перспектывы часу, які дае магчымасць рэінтэрпрэтаваць у тым ліку класічныя мастацкія тэксты па-новаму. Да гэтай пары паэма пераважна разглядалася як адлюстраванне грамадскай думкі, выражанай праз асобу героя, які праходзіць выпрабаванне вайной. Падобныя разважанні знаходзім у працы М. Грынчыка, які падкрэслівае разам з іншым ідэялагічны складнік зместу: “Іменна глыбокая народнаць, партыйнасць эстэтычных пазіцый абумовілі асноўную патрыятычную ідэю твора” [2, с. 49]; “...праз прыватную канкрэтную гісторыю выратавання брыгаднага сцяга Куляшоў імкнецца вызначыць сутнасць барацьбы дзвюх супрацьлеглых сацыяльных сіл, выявіць ідэйна-псіхалагічныя матывы гэтай тытанічнай барацьбы, раскрыць працэс гартавання волі і характару героя ва ўмовах найбольш трагічнага этапа вайны” [2, с. 50] і г.д. Сугучным падаецца меркаванне Бярозкіна Р., які аналізуе твор Куляшова пазней і больш увагі надае біяграфічнаму метаду, дапаўняючы высновы па значэнні твора глыбейшым аналізам формы. Дадаткова даследчык падкрэслівае спалучэнне грамадскага і адзінкавага сэнсавага напаўнення паэмы праз выяўленне змагання народнага і змагання асобы з варожай навалай: „Канкрэтны вобразны змест куляшоўскага «Сцяга брыгады» (іменна змест, а не толькі тэма) – невыносна цяжкія выпрабаванні і мужная барацьба народа, разгорнутыя ў жывых і непасрэдных карцінах жыцця і прапушчаных праз сэрца галоўнага героя паэмы Рыбкі” [1, с. 61]. Больш блізкія да сучаснасці працы ўтрымліваюць спробы асэнсаваць матывацыю герояў з пункту гледжання часавай перспектывы. У прыватнасці, М. Мішчанчук сцвярджае: „Не мог і Куляшоў у

сваёй напісанай «крывёю сэрца» паэме не пракрычаць лозунг пра неабходнасць помсты тым, хто прыйшоў разбураць наш край, вялікім коштам – коштам жыцця фашыстаў і нават (як гэта ні балюча нам успрымаць сёння!) іх дзяцей. Бо зноў-такі падобнае перажыванне, такі заклік – тыповая з'ява ваенных гадоў” [4, с. 102]. Прытым навуковец адназначна падкрэслівае, што прысуд Ворчыку, якога героі-чырвонаармейцы пакаралі смерцю за ўцёкі дадому, з пазіцыі сучаснасці можа быць ацэнены інакш, не так, як гэта рабілася ў ранейшых даследаваннях: „Ступень віны яго не такая, каб не даць яму магчымасці рэабілітавацца, выправіцца, паспрабаваць пачаць новае жыццё на этапе прасвятлення” [4, с. 109].

Для глыбейшага філасофска-эстэтычнага асэнсавання твора мэтазгодна звярнуць больш пільную ўвагу на тое, як разам з ідэалагічным складнікам пафасу паэмы аўтар рэалізуе аксіялогію адзінкавую, якая ўвасабляецца ў розных героях паэмы. Асабістае і грамадскае ў такім выпадку ствараюць больш складаную іерархію, якая можа змяняцца на працягу развіцця дзеяння.

Важна дадаць, што сам жанр твора абумоўлівае яго сінкрэтызм: лірычны пачатак спалучаецца з эпічным, што бачна нават у структуры тэкста. Першыя два радкі адлюстроўваюць гэта літаральна: „Як ад роднай галінкі дубовы лісток адарваны, // Родны Мінск я пакінуў, нямецкай бамбёжкаю гнаны” [3, с. 39]. Параўнанне у першых словах мае выразна лірычную афарбоўку, суб’ектыўна прасякнутую тугой чалавека па родных мясцінах. У другім радку тоесны сэнс набывае канкрэтызаваную форму: называецца месца, адкуль ідзе герой, і прычына яго сыходу; акцэнт на дзеянні выразна дадае эпічнасці. Разам з тым актуалізуецца грамадскае значэнне падзеі: вызначаецца лёс не толькі аднаго чалавека, „нямецкая бамбёжка” акрэслівае супрацьстаянне буйнейшага маштабу. Такім чынам, аўтар спалучае сферу асабістых вартасцяў чалавека, яго пачуццяў і ўяўленняў пра ўласны свет (мікракосм) са сферай грамадскіх ідэалагем, вартасцяў іншага парадку, узмоцненых запатрабаваннямі ваеннага часу, якія абвастрае, максімалізуе значэнні пэўных учынкаў і рашэнняў (макракосм).

Далей у паэме час ад часу з'яўляюцца адзначаныя тлустым шрыфтам радкі тэкста, якія, магчыма, утрымліваюць падказку, як найбольш значныя архетыпічныя ідэялагемы („добрае” – „злое”; „асабістае” – „грамадскае”; „сябра” – „вораг”; „вернасць” – „здрадніцтва” і інш.), актуалізаваныя падзеяй вайны, узаемадзейнічаюць і выбудоўваюць філасофскі змест паэмы. Вызначаюцца заўсёды два радкі, але іх наяўнасць не карэлюе з рухам сюжетнай плыні ці раздзеламі: ёсць тыя фрагменты, што ўвогуле не ўтрымліваюць дзеяння, але ёсць і тыя, што маюць пераважна сюжэтны характар; ёсць раздзелы, дзе вызначаных фрагментаў два (першы, трэці, шосты), ёсць іншыя (у другім і дзевятым – адзін фрагмент; у чацвёртым, пятым, восьмым і дзесятым – ніводнага, у сёмым – тры). Такім чынам, павінны быць іншыя паказчыкі, паводле якіх адбываецца падбор адметных радкоў. Варта разгледзець сутнасныя адрозненні маркіраваных элементаў тэкста.

Галоўны герой адправіўся ў свой шлях, пакідаючы за спіной палаючы горад. Прасторава-часавы аспект твора канкрэтызаваўся праз выкарыстанне тапоніма „Мінск” і найменняў „дзень”, „вечар”, „ноч”, „досвітак”. Перад з'яўленнем першых адзначаных радкоў герой вырашае пісаць „вандроўны дзённік”, які адсылае чытача да нядаўняга мінулага, дзе бачыцца развітанне з горадам. Менавіта тут адбываецца пераход да спробы аналізу вонкавых абставін і ўнутраных адчуванняў: „Што сказалі мне рэчы, // Калі я выходзіў з квартэры?” [3, с. 40]. Першы маркіраваны радок мае лірычны характар (ажыўляюцца рэчы), другі – эпічны (утрымліваецца дзеянне). Два займеннікі („мне”, „я”) ўказваюць на асобу героя, што падкрэслівае перавагу суб'ектыўнасці над аб'ектывізацыяй. Наступны тэкст паэмы адпавядае такому вызначэнню: эмацыйны складнік мае тут вядучую пазіцыю. Далей адбываецца пераход у іншую прастору (замест кватэры – вуліца) і задаецца наступнае пытанне, падобнае да першага: „Чым сустрэла мяне мая вуліца, // Як я выходзіў?” [3, с. 42]. Змена лакацыі не адразу набліжае героя да аб'ектывізацыі. Наадварот: родная вуліца становіцца месцам своеасаблівага пералому і кульмінацыйнага перажывання трагедыі вайны. Тры займеннікі, якія падкрэсліваюць асабісты пачатак („мяне”, „мая”, „я”), карэлююць з

далейшым тэкстам, дзе назіраецца найбольш моцная эмацыянальная напружанасць: „Рэха тысячы ног // Аглушыла мяне нечакана, // Падхапіла мяне, маё гора, // Жаданні, трывогі // І панесла за горад // Па бітаму шклу мае ногі” [3, с. 42]. Менавіта тут сустракаюцца асабістае і грамадскае: герой адчувае боль і адказнасць не толькі за сябе і сваю сям’ю, але і за „тысячы ног” – за грамадства. Пасля гэтага чытач быццам вяртаецца да пачатку паэмы, таму што амаль даслоўна паўтараецца выкарыстаны там мастацкі вобраз: „Як у час навальніцы // Ад дрэва лісток адарваны, // Пакідаў я сталіцу, // Пажарам бязлітасным гнаны” [3, с. 42]. Гэтыя радкі не маркіраваны, яны з’яўляюцца лагічным працягам сюжэта, а дакладней – вяртаннем да першапачатковай яго кропкі, таму што сюжэт не развіваўся ў папярэдніх лірычна скіраваных старонках. У падзеі вайны адбылося злучэнне аксіялагічна палярных аспектаў: „дабро” было зруйнавана „злом”. Звычайна больш адчувальнае для чалавека „асабістае” на працягу некалькіх старонак злучаецца з „грамадскім” і становіцца адным цэлым. Менавіта таму першы раздзел паэмы далей выяўляе сэнсава значную змену самасвядомасці героя, які цяпер выражае не толькі ўласнае „я”, але і ўспрымае пачуцці і жаданні іншых як „сваё”. Актуалізуецца архетыпічная апазіцыя „сябра” – „вораг”, якая становіцца адным з дамінуючых складнікаў ідэялагемы вызвалення. Найбольш яскрава гэта бачна ў прамым злучэнні сябе і іншых як актараў змагання: „Ад імя жыхароў, // Наша вуліца Нова-Маскоўская, // Гавару, што з усімі пайшоў // У чырвонае войска я” [3, с. 43]. Герой дае абяцанне вярнуцца ў родныя мясціны, але гэтае вяртанне для яго магчыма толькі ў тым выпадку, калі агульная справа перамогі над ворагам і захавання годнасці змагароў будзе вырашана, і таму абяцанне героя замацоўвае перавагу агульнага над уласным.

Другі раздзел паэмы зноў вяртае чытача ў пункт сюжэтнага выйсця: „Родны Мінск я пакінуў, // Пажарам і бомбамі гнаны” [3, с. 44]. Далей адлюстравана своеасаблівая ўнутраная барацьба героя, які асэнсоўвае рэальнасць пражытага і неабходнасць распачаць шлях змагання. Асабістае пачуццё даволі моцна падтрымліваецца ўласнай памяццю: „…як заплюшчу я вочы, // Стаіць прад вачыма // Мінск жывы, не нябожчык, – // І звоняць трамваі на плошчах, // Трупаў там я не бачу, // Не чую дзіцячага плачу” [3, с. 44]. Сем

разоў паўтараецца сімвалічнае „не веру” і адзін раз „хіба можна паверыць?”. Пераход ад намераў да больш адчувальнага дзеяння, ад эмацыйнага складніку да аб’ектывізацыі адбываецца канчаткова праз наступныя маркіраваныя радкі: „Вайсковы патруль // Дакументы мае правярае” [3, с. 45]. Эпічны аспект становіцца дамінуючым, і далей шэраг дзеянняў прыводзіць да змены былога “я” на новае. Названа імя героя, якое робіць яго постаць больш канкрэтнай, аднак тэкст падкрэслівае ўнутраную эвалюцыю: “Стаў я іншым, суровым, // Стаў новым ад ног да пілоткі, // Чалавекам вайсковым, – // Былой не пазнаеш паходкі” [3, с. 46]. „Новы” Алесь Рыбка захоўвае мінімальныя прыкметы былога, што ўзмацняе перавагу агульнага (грамадскага) над асабістым: „Я з усіх сваіх рэчаў былых, // Асабістых, адзіных, // Для паходаў узяў баявых // Лыжку, боты, гадзіннік” [3, с. 46]. Усе пералічаныя рэчы маюць утылітарнае значэнне і павінны наблізіць перамогу. Завяршаецца раздзел канчатковай пераменай героя, які становіцца адказным за брыгадны сцяг. Камісар Зарудны, увасабляючы тып годнага камандзіра, разумнага пачатку, які накіроўвае дзеянне палка і набліжае перамогу (мэту героя), сам прымае такое рашэнне, быццам персаніфікуючы ідэялагему грамадскай неабходнасці. Сімвалічна аб’яднанне двух вобразаў: сцяга, што атаясамліваецца з гонарам брыгады, і Алеся, які адчувае сябе адказным за лёс іншых. Такім чынам, грамадскі складнік робіцца выразна дамінуючым.

Трэці раздзел выяўляе баявыя дзеянні ў іх крытычным моманце: „І павінны прабіцца мы мужна // Ці мужна загінуць” [3, с. 48]. Выйсце з акружэння аказваецца амаль немагчымым, ураткавацца могуць толькі некаторыя, але важнейшым становіцца не лёс „адзінак”, а гонар „усіх”, які замацаваны ў вобразе сцяга. Менавіта таму з’яўляюцца маркіраваныя словы: „Трэба сцяг ратаваць, // Сцяг на глум і на здзек не пакіну” [3, с. 49]. Сэнс учынку падмацаваны быццам пачутымі героем словамі забітага кулямётчыка: „– Сцяг выносіш? Нясі… – // Кажа мне яго позірк упарты. – // Чэсць забітых усіх // Ты выносіш, // Мы гэтага варты” [3, с. 49]. Зарудны цяжка паранены, але яго можна паспрабаваць ураткаваць з поля бою. Менавіта тут з’яўляецца яшчэ адзін герой – наводчык, якому аўтар не дае імя. Ён засыпаны зямлёю, але, ачуняўшы, пытаецца ў Алеся, хто той такі. Паказальна, што галоўны

герой не называе ў адказ прозвішча, а гаворыць: „Свой, не бачыш?” – быццам атаясамліваючы сябе і другога чалавека. Аб’ектыўная рэальнасць часткова саступае суб’ектыўнаму адчуванню навакольнага свету. Брыгада „памёрла сягоння”, камісар, які мог усім кіраваць, непрытомны. Разумны пачатак і сэнс грамадскай неабходнасці, а з ім і асабістая мэта, могуць згубіцца. Унутраная раздвоенасць героя вяртаецца з былой сілай: зноў узнікаюць матывы нявер’я і сумневу, а разам з імі намаганні асэнсаваць сутнасць уласнага „я” (як гэта было ў другім раздзеле). Але цяпер герой згубіў іншую сям’ю, „баявую”, як ён сам яе акрэслівае. Цікава, што гаворка ідзе толькі пра двух людзей, што шукаюць выйсця з акружэння: „Дзве спіны, і дзве каскі, і ботаў // Дзве роўныя пары” [3, с. 51]. Зразумела, што калі камандзір у непрытомным стане, то ён не ідзе сам, аўтар можа мець на ўвазе галоўнага героя і наводчыка, які павінен быў дапамагчы вынесці камісара. Але ў тэксце не выяўляецца спосаб перамяшчэння, а акрэсліваецца наяўнасць і бачнасць гэтых „двух” чалавек, а не трох. Пры гэтым толькі адзін не верыць у тое, што адбываецца, не хоча прымаць рэальнасць – галоўны герой. Гэта значыць, што другі чалавек павінен верыць у тое, што адбываецца, ці не быць у стане ацэньваць рэальнасць. У першым выпадку гэта можа быць наводчык, у другім – камандзір. Наводчык не паказаны канкрэтна, згадваецца толькі тое, што галоўны герой нясе сцяг „з сябрамі”, з чаго можа вынікаць, што яму дапамагае не адзін салдат. Але камандзір не ў стане дапамагаць. Множны лік можа быць абумоўлены, па-першае, тым, што Алесь адчувае прысутнасць іншых таварышаў, якія жыва ўяўляюцца яму, калі ён заплюшчвае вочы: „Стаяць, як жывыя, // Маладыя, суровыя, // Гарадскія, вясковыя // Дзецюкі…” [3, с. 52], а з другога – тым, што сцяг ён выносіць дзеля ўсіх. Але ў такім выпадку наводчык зноў не набывае выразных прыкмет. Гэты вобраз падобны да ценя галоўнага героя, своеасаблівага двойніка, што яшчэ больш выразна падкрэслівае суб’ектыўны пачатак перажыванняў Алеся, які зноў па-іншаму акрэслівае ўласную „самасць”: „Чалавек гэты – я. // Так, не веру, не верыцца мне …” [3, с. 52]. На змену аб’ектывізацыі і перавазе грамадскага прыходзіць неакрэсленасць і неабходнасць пошуку далейшых арыенціраў. Гэта падкрэсліваецца і маркіраванымі радкамі, якія маюць пазасюжэтнае гучанне:

„Безназоўны ручай нас прывёў // У сасновую цішу” [3, с. 52]. Трэці раздзел заканчваецца канстатацыяй таго, што Зарудны будзе жыць, але усе героі (незалежна ад іх рэальнай колькасці) быццам пераходзяць у іншае часава-прасторавае вымярэнне: камандзір зноў заплюшчвае вочы, „мы таксама заснулі” [3, с. 53].

Чацверты раздзел пераносіць чытача ў свет лесніка і леснічыхі, што ўвасабляюць тып чалавека працы, добрага і спагадлівага. Традыцыйны мікрасвет беларускай літаратуры, які звязваецца з архетыпічным уяўленнем пра „сябра”, а разам з тым пра „бацьку” і „маці” (нездарма гаспадыня называе герояў „роднымі”), вымалёўваецца аўтарам як сфера гаючай моцы. Усе набіраюцца сіл, Зарудны пытаецца пра сцяг, Алесь паказвае яго – і ранейшая мэта актуалізуецца з новай сілай, калі камандзір загадвае: „Вынось // Сцяг брыгады” [3, с. 56]. Разумны пачатак зноў гучыць больш ясна, грамадская неабходнасць становіцца больш важкай. І толькі тут упершыню згадваецца прозвішча таварыша Алеся: „Ворчык рвецца пайсці”. Алесь адказвае яму: „Пачакаем” [3, с. 57]. Калі ўспрымаць другога салдата як двайніка галоўнага героя, выразнай становіцца супрацьлегласць іх пазіцый, якая можа адлюстроўваць унутраную раздвоенасць чалавека. З аднаго боку, трэба паслухацца загаду, тым больш што ён адпавядае пачатковай мэце і героя, і брыгады, да таго ж карэлюе з грамадскім складнікам агульна прынятых каштоўнасцей. У такім разуменні жаданне Ворчыка можа быць асэнсавана як слушнае. З другога боку, складана пакідаць у цяжкім стане камандзіра, якому зноў стала горш, таму што грамадская значнасць учынку губляе вартасць, калі гэты ўчынак спалучаецца са шкодай для іншага чалавека. Можна пагадзіцца з тым, што загад даў сам камандзір, які застаецца ў добрых надзейных людзей. Але варта адзначыць і тое, што спяшацца героям няма куды: яны нічога не губляюць, калі правядуць больш часу ў леснічоўцы, справе гэта не пашкодзіць. Грамадскае не будзе спрэчна з асабістым. Пасля выздараўлення разумее гэта і Зарудны: „Мы яго пачакалі. // Ён гэтаму рады. // Мы ў згодзе” [3, с. 57]. Такім чынам, у раздзеле няма пералому унутранага „я”, хоць і абмалявана развіццё унутранага канфлікту Алеся.

У пятым раздзеле героі працягваюць свой шлях, вярнуўшыся ў прастору вандроўкі па лясах і палях. У самым пачатку аўтар побач з Алесем выяўляе вобраз ценя, які сімвалізуе іншую сутнасць героя, што дысаніруе з яго цяперашнім адчуваннем уласнага „я”: „Не магу аніяк // Я з уласным асвойтацца ценем. Недаверліва сам на сябе // Паглядаю я збоку” [3, с. 58]. Матыў унутранай раздвоенасці набывае вонкавую форму. Адразу пасля гэтага згадваюцца іншыя імёны, якія абралі сабе галоўныя героі, каб ніхто не пазнаў іх у дарозе, калі давядзецца недзе спыніцца, і каб мець магчымасць здзейсніць намер вярнуць сцяг брыгады. Толькі адно імя застаецца нязменным: наводчык па-ранейшаму Ворчык, хоць на гэтым не заваструецца ўвага: „Быў я Рыбкай Алесем, // А стаў – Палыном Нікадзімам. // Так, цяпер я – Палын, // А таварыш мой – Ворчык Мікіта, // А Зарудны – Смірноў” [3, с. 58]. Акрамя таго, Алесь называе другога салдата „таварыш мой”, не „наш”, быццам Зарудны не звязаны аніякімі адносінамі з ім. Аднак далей падкрэсліваецца: “Трох нас полем ішло, // Гурт рашучы, хаця невялікі” [3, с. 59]. Пачынаецца выпрабаванне герояў. Ім давядзецца сутыкнуцца з землякамі, якія сталі ворагамі. З’яўляецца тып героя-здрадніка: Мядзведзкі, „прыслугач нямецкі”, прымушае сялянскую дзяўчыну выйсці за яго замуж. Героі стаяць перад выбарам: дапамагчы дзяўчыне з рызыкам выкрыцця ці ісці далей да сваёй мэты, не звяртаючы ўвагу на „асабістае”. Яны гавораць, што ідуць „з астрогу” і застаюцца на вяселлі, назіраючы за тым, як разгортваюцца падзеі. Мікіта Ворчык нават пачынае танцаваць, ды так, што некаторыя сяляне і самі забываюць пра рэальны стан рэчаў. У сваю чаргу, Зарудны-Смірноў пасля ганарыстай прамовы здрадніка выносіць яму прысуд, жадаючы смерці. Аднак забівае ворага нехта іншы, хто не персаніфікуецца ў тэксце, але можа ўвасабляць грамадскую неабходнасць. Алесь-Нікадзім застаецца толькі сведкам падзей, знаходзячыся быццам між палюсоў: выяўлення магчымага асабістага бесклапотнага адпачынку і неабходнай рэакцыі на крыўду іншых. У гэтым раздзеле канфлікт паміж названымі вектарамі не рэалізуецца, таму што першы падпарадкоўваецца другому, дапамагаючы яго здзяйсненню.

Шосты раздзел прыносіць іншае выпрабаванне, якое аказваецца больш складаным, таму што мае выгляд дабра, але ўяўляе сабой трывожны знак. Калі здраднік Мядзведзкі успрымаецца як вораг адразу, то прадстаўленая тут гераіня здаецца спагадлівай і па-сяброўску мілай. Але яна ўвасабляе тып спакусніцы. Жаданне ўласнага адпачынку, прадстаўленае ў папярэднім раздзеле толькі ўскосна, тут становіцца значна мацнейшым. Нездарма з'яўляюцца маркіраванныя радкі: „Так мы трапілі да Лізаветы – // Вясёлай кабеты" [3, с. 64]. Вясёлая кабета прапануе героям (здаецца, што ўсім па чарзе) фактычна адмовіцца ад іх мэты і аддаць перавагу ўласна асабістаму камфорту, а не агульнасцвярджальным каштоўнасцям. Яна абясцэньвае іх памкненні тым, што пад відам жадання лепшай долі для байцоў агучвае ім аргументы супраць далейшых крокаў да вяртання сцяга. Сімвалічна, што Алесю яна гаворыць, што была ўжо ў хаце (дзе начуе Зарудны), у клеці (дзе спіць Ворчык), а цяпер прыйшла да яго. Аднак пасля адмаовы застацца з удавою Лізавета вяртаецца ў клець. Зранку героі сыходзяць і працягваюць шлях, і аўтар маркіруе яшчэ два радкі: „На дажынках прыгонныя жнеі // Нам песню спявалі" [3, с. 67]. Важным напамінам пра тое, што родная зямля акупіравана ворагам, з'яўляецца слова „прыгонныя". Да таго ж сэнс выяўленай песні выразна актуалізуе грамадскую значнасць змагання з фашыстамі. Маркіраваныя радкі ў гэтым раздзеле вызначаюць раскол каштоўнаснай сферы на „асабістае" і „грамадскае", які абвастраецца да праяўлення канфлікту. Аднак унутраны надлом выяўлены не праз вусны Алеся, а праз крык Мікіты, які выказвае ўсе сумненні, што выклікаюць адчуванне марнасці іх справы. Герой не хоча пець песню прыгонных жней (магчыма, таму, што яна нагадвае пра грамадзянскі абавязак), ён хоча слухаць радыё (верагодна, там ён шукае адказу на свае пытанні, бо Лізавета казала, што па радыё чула навіны пра нямецкія поспехі). Варта адзначыць, што Ворчык не зрабіў свайго выбару, ён шчыра дзеліцца з іншымі сваімі маркотнымі думкамі і шукае аргументаў.

У сёмым раздзеле героі слухаюць радыё, але не нямецкае, а партызанскае. Голас Левітана перадае навіны. Бяда ў тым, што яны „радуюць мала" [3, с. 70]. Аднак у Алеся гэтыя навіны разам з успамінамі пра жонку і

дзяцей выклікаюць горыч і жаданне дайсці да мэты, каб усё было не дарма. Здаецца, і Ворчык спяшаецца рэалізаваць распачатае, пра што ён дае знаць таварышам. Лагічным працягам было б узмацненне дынамікі дзеяння. Але з’яўляюцца маркіраваныя радкі, якія маюць выразна лірычны пачатак: „Зноў лясы, паплавы, // Сцежкі росныя ў полі” [3, с. 71]. Дысананс паглыбляецца прамым тэкстам: „Толькі дзіўна, чаму // Не спяшаецца Ворчык Мікіта” [3, с. 71]. Далей адбываецца праясненне: побач родныя мясціны Мікіты. Маркіруюцца яшчэ два радкі: „Мы здагадваемся, чаму // Занудзіўся Мікіта” [3, с. 72]. Асабістае набірае моцы, але знаходзіць разуменне ў кожнага героя, таму што кожны жыве і асабістым, і агульным. Толькі нядаўна і Алесь успамінаў пра родных. Ноч становіцца вырашальнай. У кароткім фрагменце тэкста, што пададзены перад наступнымі маркіраванымі радкамі, адбываецца значная змена. Алесь і Мікіта сімвалічна аб’яднаны пад адной ватоўкай, быццам адзін чалавек з двума магчымымі шляхамі. Унутраная раздвоенасць рэалізуецца амаль літаральна: „Ад мяне адвярнуўся спіной, // Спіць Мікіта. І я засынаю. // Ноч. // Шумела над ім, нада мной // Доўга хвоя старая” [3, с. 72]. Дрэвы аднолькава шумяць над героямі, абставіны ў іх вельмі падобныя (сям’я, жаданне адмовіць ваеннай рэальнасці), але выбар розны. Тлустым шрыфтам адзначана: „Я прачнуўся паўночнай парой. // Зуб на зуб не трапляе” [3, с. 72]. Адразу пасля гэтага дзеянне інтэнсіфікуецца. Калі Ворчык знік, не засталося ваганняў: не можа асабістае быць вышэйшым за грамадскае, таму што для герояў зараз не засталося асабістага, і грамадскае – гэта тое адзінае, за што яны могуць трымацца, каб не згубіць сэнс далейшага існавання і каб іх уласнае асабістае мела шанец на працяг. Іх мары былі звязаны са зваротам сцяга і аднаўленнем брыгады, з далейшымі змаганнямі аж да самай перамогі дзеля жыцця не толькі ўласнага, а і ўсіх тых, хто быў страшна пакрыўджаны на роднай зямлі. Усё гэта звязана не столькі з Мікітай, колькі са сцягам, зашытым у ватоўцы, якую Ворчык забраў. Зарудны і Алесь адпраўляюцца за ім.

Восьмы раздзел паказвае вырашэнне сюжэтнага канфлікту. Спачатку прапануюцца тры верагодныя прычыны ўчынку Мікіты: Ворчык свядома забраў сцяг, каб данесці яго самому і стаць героем; ён усё ж проста захацеў

мірнага жыцця, не змагаючыся з ворагам; былы паплечнік вырашыў стаць здраднікам і панёс сцяг фашыстам, каб узамен папрасіць спакою. Першы варыянт хоць і крыўдны, але прымальны для герояў, таму што ён не супярэчыць грамадскаму дабру і дае магчымасць рэалізаваць першапачатковую мэту. Другі варыянт зразумелы, але не дае адказу на пытанне, навошта забіраць сцяг. Трэці варыянт застаецца без ацэнкі ў тэксце, таму што яна не выклікае сумненняў. Калі героі дабіраюцца да дому Мікіты, становіцца ясна, што першы і трэці варыянты не адпавядаюць рэальнасці. З'яўляецца і адказ на пытанне: Ворчык проста забыўся пра сцяг, які перастаў для яго існаваць як каштоўнасць тады, калі ўласнае пачало пераважаць над агульным. Ад самой Лізавецінай хаты герой адчувае жаданне, супрацьлеглае былой мэце. Ён зняверыўся ў магчымасці перамогі і адмовіўся ад яе як ад вартасці. Разам з тым для яго перастаў быць значным сцяг. Але для Алеся і Заруднага гэта не толькі адмова ў перамозе грамадскай, гэта абраза гонару таварышаў, якія загінулі, а таксама дэкларацыя адсутнасці сэнсу ў жыцці галоўных герояў, якія сваё ўласнае паяднані з грамадскім. І нават асабістая трагедыя Ворчыка не апраўдвае яго. Здаецца, няма нічога горш, чым пачуць у доме, куды ты так спяшаўся, навіну пра тое, што жонка павесілася, ратуючы сябе ад фашыстаў. Да таго ж яе запіска говорыць, што Марына не хоча „нявольніцай жыць", а Мікіта пагадзіўся з нявольніцтвам. Магчыма, калі б ён памятаў пра сцяг і пакінуў яго таварышам ці пасля бяды дома адразу адправіўся са сцягам далей, то лёс яго вырашыўся б інакш. Але дзіўнай падаецца спроба апраўдацца асабістым горам: „Сцяг? Хіба яго ўспомніць я мог, // Ачуняць ад страты?.." [3, с. 78]. Мікіта быццам забываецца, што сам перад гэтым расказваў, як думка пра бессэнсоўнасць змаганняў не давала яму спакою ад Лізавецінай хаты. Не разумее ён спачатку і таго, навошта пытаюцца Алесь і Зарудны пра ватоўку: „ – Холад быў… Вы ж маглі адной, // Камісаравай, акрывацца… // А ці след з драбязы такой // На мяне злавацца?" [3, с. 77]. Гэта і становіцца вырашальным. Сэнс не ў тым, што Мікіта нават не падумаў пакінуць ватоўку таварышам, каб ім было цяплей у дарозе, калі ён застанецца дома, а ў тым, што для яго ўсё гэта стала драбязою ў параўнанні са сваім дабрабытам. Магчыма, па сённяшніх мерках смяротны прысуд

Ворчыку – занадта жорсткае пакаранне, але варта звярнуць увагу на тое, як развівалася на працягу тэкста суаднесенасць архетыпічных ідэялагем „асабістае – грамадскае”. Мікіта не толькі сам не захацеў змагацца, ён адабраў гэтую магчымасць у баявых таварышаў, жывых і мёртвых: „Не прыйшлі б мы, ён бы аб ім // І не ўспомніў ніколі” [3, с. 78]. Паказальна, што гэты раздзел не ўтрымлівае ніводнага маркіраванага радка. Звязана гэта можа быць з тым, што намер галоўнага героя, які прайшоў усе выпрабаванні з гонарам, тут застаецца нязломным: ён па-ранейшаму хоча данесці сцяг. Актуалізуюцца ідэялагемы „вернасць – здрадніцтва”. Калі б Ворчык вырашаў толькі за сябе і не руйнаваў чужое, ён мог бы застацца жыць, як Лізавета, але сваім учынкам ён перакрэсліў „асабістае” іншых і грамадскае на розных узроўнях (брыгады, арміі, народа).

Дзевяты раздзел выяўляе ўласнае выпрабаванне галоўнага героя, які таксама аказваецца недалёка ад роднага дому. Суб’ектыўныя перажыванні востра цягнуць яго да сям’і, але разам з тым ён думае пра тое, што сказаць дзецям пра пакуты, якіх так шмат навокал. Вырашальныя словы маркіруюцца аўтарам: „Бывайце здаровы, // Звароту чакайце!” [3, с. 82]. Яны падобныя да таго рашэння, што было агучана ў пачатку паэмы, таму больш маркіраваных радкоў у творы няма. Кампазіцыя ідэялагем замкнулася. Тое, што героі не пазбаўлены чуласці да гора бліжняга, што яны не механічныя выканаўцы грамадскага запатрабавання, а жывыя людзі, якія могуць спачуваць, падкрэслена ў эпізодзе з хлопчыкам, якому Алесь аддае ўвесь хлеб, што прыпасены на дарогу. Яны б, думаецца, шчыра спачувалі і Ворчыку, каб не адабраў ён у іх увесь сэнс іх жыцця падчас жудаснай навалы вайны, якая дэфармуе прывычныя правілы. Але героі цяпер не здольныя спачуваць ворагу. У дзесятым раздзеле вельмі коратка прадстаўлена расправа з фашыстам: „Падпаўзлі. Задушылі. // Далей // Папаўзлі асцярожна” [3, с. 86]. У развіцці раздзела аб’ядноўваюцца тыя матывы, што гучалі і раней у паэме: героі выбраліся з акупаванай тэрыторыі, запісы дзённіка падыходзяць да завяршэння, прысуд ворагу вынесены, радыё настроена на Маскву, гадзіннік адлічвае час да перамогі. Эпілог прадстаўляе рэалізацыю галоўнай мэты

героя: аднoўленая брыгада са сваім сцягам падыходзіць ў вызваленчым руху да сяла.

Такім чынам, паралельна сюжэту паэмы з дапамогай шэрагу чалавечых тыпаў і выпрабавальных абставінаў аўтарам рэалізуецца лінія развіцця архетыпічных ідэялагем, якія будуюць іерархію каштоўнасцей ад асабістага да грамадскага, злучаючы іх у адно. А. Куляшоў суадносіць эпічны пачатак з аб’ектывізацыяй і грамадскай значнасцю, а лірычны пачатак – з суб’ектывізацыяй і асабістым перажываннем героя. Для ўзмацнення ідэйнай сферы твора выкарыстоўваецца прыём двайніка, які дазваляе падкрэсліць значнасць выбару чалавека, асабліва ва ўмовах антычалавечых.

**Бібліяграфія:**

1. Бярозкін, Р. Аркадзь Кулышоў. Нарыс Жыцця і творчасці / Р. Бырозкін. – Мінск : Народная асвета, 1978. – 192 с.

2. Грынчык, М. Аркадзь Куляшоў. Крытыка біяграфічны нарыс / М. Грынчык. – Мінск : Выдавецтва “Беларусь”, 1964. – 160 с.

3. Куляшоў, А. Выбраныя творы / А. Куляшоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. – 206 с.

4. Мішчанчук, М. І. Класіка – сучаснасць – перспектывы: пра літаратурны працэс ХХ стагоддзя : манаграфія / М. І. Мішчанчук ; навук. рэд. З. П. Мельнікава. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2009. – 188 с.

**Dr Olga Kowalczuk**

docent przy Katedrze Literatury Rosyjskiej I Dziennikarstwa Brzeskiego Uniwersytetu Państwowego imienia A.S.  Puszkina; docent

**Volha Kavalchuk**

Candidate of philological sciences, Docent of the Department of Russian Literature and Journalism of Brest State A.S. Pushkin University; Associated Professor.

**Personal and social in the context of military events in A. Kuleshov's poem "The Brigade Banner": a gallery of human types, archetypal ideologems**